Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 33 (177) | 21—30 лістапада | 1934 г.

ЗМЕСТ

СІНАПТЫЧНЫ АГЛЯД

Пачынаючы з першага і да апошняга дня гэтай дэкады тэрыторыя БССР бесперапынна знаходзілася пад уплывам цыклонічнай дзейнасці ў большасці складаўшыхся з мас кантынентальна-палярнага паветра.

21 лістапада з Украіны ў паўночна-заходнім напрамку рухаўся цыклон, які распаўсюджваўся на тэрыторыю БССР. Гэты цыклон складаючыся з мас цёплага кантынентальнага палярнага паветра выклікаў павышэнне т-ры ноччу да 0+1°, а ў дзень да +3°.

Цёплы фронт гэтага цыклона праходзячы па тэрыторыі Заходняй вобласці выклікае на тэрыторыі БССР поўную воблачнасць і значнае выпадзенне ападкаў.

Тым часам з боку Скандынавіі, у паўнёва-усходнім напрамку працягвалася лажбіна ад цыклона, які знаходзіўся ў Нарвежскім моры. Гэты цыклон складаючыся з мас морскага арктычнага паветра, якое потым ператвараецца ў масы кантынентальна палярнага паветра, але больш халодныя чым масы паўднёвага цыклона.

Табліца вынікаў метэаралагічных

№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра																Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %
		21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі наглід. мінімум	
2	Дрыса . .	1	0	3	0	3	0	—2	5	1	0	—	0	—	7	—5	26	85
13	Полацк . .	2	0	2	0	0	—3	—3	5	2	0	—	0	—2	7	—5	27	85
68	Гарадок . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
7	Нова-Каралёва . . .	2	0	0	0	—2	—4	—3	2	1	—1	—	—1	—3	6	—	26	87
8	Лепель . .	2	0	2	0	—1	—2	—4	4	2	0	—	0	—	7	—7	27	89
75	Плешчаніцы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
70	Бобр . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
13	Барысаў . .	2	1	3	1	—1	—3	—4	3	3	—1	—	1	—2	8	—9	27	83
16	Менск. . .	2	0	3	1	—1	—2	—4	5	3	0	—	1	—2	7	—5	27	86
93	Бярэзіна . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
23	Мар'іна-Горка	2	0	1	—1	—1	—3	—4	4	3	0	—	0	—2	8	—8	27	—
25	Асіпавічы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
10	Орша. . .	2	0	2	1	—1	—3	—2	2	2	0	—	0	—3	6	—4	27	87
19	Горкі . . .	2	0	2	0	—1	—4	—2	1	2	—1	—	0	—3	6	—7	26	88
89	Клічаў . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
28	Слуцк . .	2	0	0	1	—1	—2	—5	4	3	0	—	0	—	7	—9	27	88
30	Мар.-Сосны .	2	1	3	1	—1	—5	—4	4	5	1	—	1	—1	8	—12	27	85
21	Магілеў . .	2	0	2	0	—1	—4	—2	2	3	0	—	0	—2	7	—7	26	89
73	Чавусы . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	Чэрыкаў .	2	1	2	0	—1	—2	—2	1	2	0	—	0	—2	7	—3	27	84
191	Касцюковічы.	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
31	Турск . .	2	1	2	1	—1	—2	—2	2	3	0	—	1	—2	7	—4	26	85
32.	Жлобін .	2	0	2	1	—1	—2	—2	2	3	0	—	1	—2	7	—5	26	84
33	Жыткавічы .	3	3	5	1	0	0	—3	—	—	—	—	—	—1	8	—11	27	86
37	Калінкавічы .	2	1	3	1	0	—2	—3	3	5	1	—	1	—1	7	—4	27	85
39	Лельчыцы .	2	1	4	1	0	—2	—4	4	5	1	—	1	—	8	—	—	—
85	Чэчэрск . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
83	Барба . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
38	Гомель . .	3	1	2	1	—1	—1	—2	2	3	0	—	1	—2	7	—3	27	82
35	Васілевічы .	2	1	3	1	0	—2	—2	3	5	1	—	1	—1	7	—	—	86
40	Людвінава .	2	1	2	2	—1	—1	2	3	4	1	—	1	—1	8	—4	28	86

х назіранняў з 21—30 лістапада 1934 г.

Число, калі нагляд. мінімум	Адносная вільготнасць паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы: Максімал.	Тэмпература паверхні глебы: Мінімальн.	Тэмпература паверхні глебы: Число, калі нагляд. мінімум	Ападкі ў мм: 21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	—	Сума	Метэаралагічныя з'явы (у дужках адзначаны числы)
26	85	—	—5	27	1.0	0.2	2.0	1.0	0.4	..	1.0	1.0	0.2	..	—	6.8	—
27	85	—	—	—	1.0	1.0	2.0	5.0	0.4	—	—	—	0.1	1.0	—	—	туман (28)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
26	87	6	—6	26	2.0	0.4	1.0	5.0	0.3	..	3.0	4.0	1.0	..	—	16.7	туман (23)
27	89	—	—5	27	7.0	3.0	2.0	3.0	1.0	0.1	3.0	1.0	..	0.4	—	20.5	мяцель (23)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	83	—	—	—	2.0	2.0	3.0	1.0	2.0	..	4.0	3.0	..	..	—	17.0	—
27	86	6	—3	—	3.0	1.0	2.0	3.0	2.0	0.1	7.0	6.0	0.1	0.3	—	24.1	мецель (27) туман (23)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	—	—	—	19	4.0	1.0	1.0	0.4	1.0	0.4	1.0	2.0	..	..	—	10.8	туман (23)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	87	4	—2	27	2.0	2.0	2.0	2.0	3.0	0.4	3.0	3.0	0.1	0.2	—	17.7	туман (22, 23)
26	88	4	—4	26	5.0	1.0	3.0	1.0	3.0	0.1	1.0	3.0	0.1	0.1	—	17.3	туман (22, 23)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	88	—	—8	27	3.0	0.2	1.0	2.0	2.0	0.2	2.0	2.0	..	..	—	14.2	туман (22), бура (28)
27	85	—	—	—	3.0	1.0	2.0	10.0	2.0	0.3	3.0	1.0	2.0	0.5	—	24.8	туман (22, 27)
26	89	—	—	—	7.0	1.0	2.0	2.0	2.0	1.0	3.0	2.0	..	2.0	—	22.0	туман (28)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	84	—	—	—	15.0	1.0	4.0	1.0	1.0	0.1	0.1	1.0	0.1	0.1	—	23.4	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
26	85	6	—8	26	9.0	2.0	2.0	1.0	2.0	0.1	1.0	3.0	..	..	—	20.1	туман (30)
26	84	—	—	—	13.0	3.0	2.0	2.0	3.0	..	1.0	4.0	..	..	—	28.0	—
27	86	—	—	—	5.0	1.0	1.0	..	4.0	..	3.0	1.0	3.0	1.0	—	19.0	туман (26, 27)
27	85	—	—	—	7.0	5.0	0.3	0.2	4.0	0.1	1.0	1.0	1.0	..	—	19.6	туман (28)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	10.0	5.0	2.0	0.4	1.0	0.3	0.5	3.0	..	..	—	22.2	туман (21, 28)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
27	82	—	—4	30	13.0	4.0	1.0	1.0	2.0	0.1	0.1	4.0	0.1	..	—	25.3	туман (28)
—	86	—	—5	27	7.0	3.0	0.6	0.3	3.0	..	1.0	1.0	2.0	..	—	17.9	туман (28)
28	86	—	—6	27	4.0	12.0	1.0	0.2	3.0	0.2	0.1	0.1	..	..	—	20.6	—

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў з 21—30 лістапада 1934 г.

№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы — Напрамак	Вецер: Пераважаючы — Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю — Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю — Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме — Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме — Ніжняя	Сярэдні стан паверхнага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
2	Дрыса	N	6	W	15	—	9	8	вільготная
43	Полацк	W	4	W	9	—	10	10	вільготная
68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
7	Нова-Каралёва	NE	6	W	12	4	10	10	мокрая
8	Лепель	NW	6	NW	12	—	9	9	замёрзшая
75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—
70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
13	Барысаў	NW	4	NW	10	—	8	8	замёрзшая
16	Менск	NW	4	NW	10	—	10	9	замёрзшая
93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
23	Мар'іна-Горка	—	—	—	—	—	8	—	замёрзшая
25	Асіпавічы	—	—	—	—	—	—	—	—
10	Орша	NW	4	NW	12	—	8	8	сухая
19	Горкі	NW	6	NW	15	6	10	10	замёрзшая
89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
28	Слуцк	NW	6	NW	18	—	9	8	замёрзшая
30	Мар'іна-Сосны	N	4	W	7	—	8	8	вільготная
21	Магілеў	N	4	W	9	—	9	8	замёрзшая
73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
27	Чэрыкаў	W	6	NW	12	—	9	9	замёрзшая
191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
31	Турск	W	4	NW	14	—	8	8	замёрзшая
32	Жлобін	NW	4	NW	12	—	8	8	вільготная
33	Жыткавічы	W	4	W	9	—	8	8	вільготная
37	Калінкавічы	W	4	E	9	—	10	8	вільготная
39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	9	—	—
85	Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—
83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
38	Гомель	NW	4	NW	9	—	9	8	замёрзшая
35	Васілевічы	NW	4	NW	10	10	9	9	вільготная
40	Людвінава	W	6	NW	17	—	10	10	—

23 лістапада паўднёвы цыклон уваходзіць у сістэму Скандынаўскага цыклона. Такім чынам 23/XI тэрыторыя Беларусі ўжо падпадае пад уплыў больш халодных мас кантынентальна палярнага паветра. У гэты дзень праз Беларусь праходзіць халодны фронт, што выклікае выпадзенне ападкаў, як у выглядзе снега, так і дажджу, а таксама і ўтварэнне туманаў. Уваходжанне халодных мас на тэрыторыю БССР выклікае паніжэнне т-ры даходзячы 27-га лістапада да мінус 10° (Слуцк) і мінус 11° (Жыткавічы) ноччу і ад 0 да —4° у дзень. У гэты-ж дзень з боку Заходняй Еўропы і Скандынавіі рухаюцца цёплыя масы морскага палярнага паветра, якія 28-лістапада ўжо цалкам захапілі БССР і ў гэты-ж дзень праз тэрыторыю БССР праходзіў цёплы фронт (акклюзія), які выклікаў выпадзенне ападкаў, поўную воблачнасць, утварэнне туманаў і падвышэнне тэмпературы даходзячай 29 лістапада да +1°, +6° ноччу і да +2°, +8 удзень.

У апошні дзень гэтай дэкады ападкі паказаны толькі ў паўночнай частцы БССР у большай-жа частцы ападкаў не было, дзякуючы таму, што цыклон пачаў рухацца на паўночны ўсход і на яго месца рухаецца з захада ў абласць павышанага ціску, якая складаецца з мас больш халоднага кантынентальна палярнага паветра.

Наогул гэта дэкада вельмі цыкланічна з моцнымі вятрамі і значным выпадзеннем ападкаў, поўнай воблачнасцю і невялікім ваганнем т-ры.

Фізік Івашчэнка.

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за 21—30 лістапада 1934 г.

Тэмпература паветра ў гэту дэкаду трымалася яшчэ даволі высокая. Спачатку дэкады сярэдняя сутачная т-ра вагалася ў межах ад 0° да +5°. З 25-га т-ра знізілася ніжэй 0°, месцамі да —5°. 28-га т-ра зноў павысілася да +1,+5°. У апошнія дні дэкады зноў значна панізілася.

Сярэдняя дэкадная т-ра вагалася ад —1 да +1°. Такім чынам, тэмпература для гэтай дэкады была на 2-3° вышэй нармальнай.

Максімальная т-ра была роўна +6, +8°, мінімальная т-ра вагалася ў шырокіх межах, ад —3 да —12°.

Сума ападкаў за дэкаду вагалася ад 7 да 28 мм. на большасці станцый адзначана каля 20 мм. Некалькі менш ападкаў адзначана на поўначы і месцамі на захадзе БССР.

На працягу дэкады, ападкі пераважна выпадалі ў першыя дні і ў сярэдзіне дэкады. Апошнія дні былі пераважна сухія.

Вятры пераважалі паўночна-заходнія, з даволі значнай хуткасцю, у сярэднім 4-6 м/сек.

Воблачнасць складала ад 80 да 100% агульнага пакрыцця неба.

Н. Малішэўская.

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за III дэкаду лістапада 1934 г.

У справаздачную дэкаду адбылося канчатковае спыненне вегетацыі (роста) азімых культур па ўсёй БССР.

Дзякуючы наглядаўшымся ў папярэднія дэкады хістанням тэмпературы з наяўнасцю незначных прымаразкаў, азімыя к моманту спынення вегетацыі былі падрыхтаваны да перазімоўкі. Наглядаўшыеся ў справаздачную дэкаду мінімумы дахадзіўшыя месцамі да —12⁰ (глядзі табліцу метэаралагічных назіранняў) для азімых не былі шкоднымі.

В. Стэфановіч.

СЛУЖБА ГІДРАПРАГНОЗАЎ І ЯЕ ЗАДАЧЫ

Мэтавай устаноўкай работы Службы Гідрапрагнозаў з'яўляецца своечасовае папярэджванне зацікаўленых прадпрыемстваў і ўстаноў нашай нар. гаспадаркі аб чакаемым ходзе паграҗаючых з'яў на рэках, каналах, азёрах і інш. К такім паграҗаючым з'явам адносяцца праходжанне паводкаў, ледаходы, заторы лёду, ледаставы, абмяленні і г. д.

Асаблівую актуальнасць ва ўмовах БССР набывае пытанне аб папярэднім і своечасовым прараканні вышыні чакаемага веснавога паўнаводдзя, бо апошняе вельмі часта суправаджаецца значнымі стратамі прынасімымі кожны год нашай соцыялістычнай гаспадарке.

У фізіка-геаграфічных умовах БССР найвялікшыя паўнаводдзі наглядаюцца вясной ад бурнага веснавога таяння снега і стока талых вод. Не выключана таксама магчымасць узнікнення на нашых рэках і летніх, асабліва вясенніх, паводкаў, якія выкліканы значным выпадзеннем атмасферных ападкаў, што можна было наглядаць у восень 1933 г.

Папярэднія гідралагічныя прараканні прыводзяць к таму, што мы арганізавана сустракаем стыхійныя з'явы на рэках і забяспечваем своечасовае прыняцце неабходных мер барацьбы з імі.

Служба гідрапрагнозаў у СССР яшчэ маладая, а дзякуючы гэтаму яна павінна з аднаго боку, займацца прапрацоўкай методык гідрапрараканняў, а з другога боку, паступова падымаць на вышэйшую ступень абслугоўванне патрэб усей соцыялістычнай гаспадаркі цалкам, дасягаючы максімальнай апраўдываемасці гідрапрараканняў.

У БССР пытаннямі гідрапрараканняў займаецца група гідрапрагнозаў і Інфармацый Аддзела Гідралогіі Галоўнага Кіраўніцтва Адзінай Гідра-Метэаралагічнай Службы БССР. Служба гідрапрараканняў арганізавана ў 1932 годзе і з гэтага часу яна рэгулярна кожны год абслугоўвае ўсе зацікаўленыя арганізацыі папярэднімі звесткамі аб чакаемай вышыні веснавога паўнаводдзя, часу ўскрыцця і замярзання па асобных рэках БССР і распрацаваць мэтодыку прараканння для ўмоў рэк БССР. Нягледзячы на кароткі тэрмін існавання

службы гідрапрараканняў апошняя зрабіла значны крок у пытанні аб методыцы гідрапрагнозаў ва ўмовах БССР.

У сучасны момант у скончаным выглядзе мы маем праработаныя мэтады доўгатэрміновых прагнозаў, даваемых на тэрмін ад 1 і больш месяцаў уперад, для прараканьня веснавых паводкаў на рэках Бярэзіне, Сожу, Зах. Дзвіне і Свіслачы ля Менска па ўліку папярэдніх гідраметэаралагічных умоў па паасобных басэйнах. Распрацаваны таксама, некаторыя метады для прараканьня часу ўскрыцця і замярзання рэк.

Акрамя гэтага, праработана методыка кароткатэрміновых прагнозаў, г. зн. складзеных за 1—10 дзён уперад, для прараканьня вышыні паводкаў, выкліканых значнымі выпадзеннямі дажджэй—на рэках Зах. Дзвіне, Бярэзіне, і Сожу, і па ўліку колькасці выпаўшых ападкаў.

Такім чынам, з моманта арганізацыі службы гідрапрагнозаў у БССР і да бягучага часу былі праведзены, галоўным чынам, навукова-даследчыя работы па адшуканю методык прараканняў, найбольш адпавядаючых умовам БССР. Цяпер, калі ўжо часткова ўстаноўлена методыка складання гідрапрагнозаў па рэкам Зах. Дзвіне, Бярэзіне і Сожу есць магчымасць разгарнуць па ім больш поўнае абслугоўванне прагнозамі і інфармацыяй патрэб воднага транспарта, сплава, сельскай гаспадаркі, комунальнай гаспадаркі і г. д.

А. Свадкоўскі.

АБ МЕТАБСЛУГОЎВАННІ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТА

Надышла зіма—самы цяжкі перыяд для работы чыгуначнага транспарта. Мяцеліцы, снегапады, моцныя вятры, марозы галалёд, ізмаразь, туманы і іншыя з'явы надвор'я сваім шкодным уплывам на работу чыгуначнага транспарта, якая праходзіць у большасці на адчыненым паветры, могуць выклікаць перабоі ў яго працы і нанесці дзяржаве вялікія матэрыяльныя страты, калі не падрыхтавана сустрэць зіму на чыгунцы.

На адну толькі снегабарацьбу дзяржава штогод укладвае да 15 міл. руб., не ўлічваючы страт ад перарываў у руху цягнікоў, якія бываюць на некалькі сутак.

Агульная-ж сума сродкаў укладваемых дзяржавай на барацьбу з усімі шкоднымі з'явамі надвор'я штогод даходзіць да сотні міл. руб. Большая частка гэтых выдаткаў прыпадае на зімовы перыяд.

Адсюль, зразумела, наколькі вялікае значэнне мае гідрометабслугоўванне чыгуначнага транспарта наогул і ў прыватнасці інфармацыйная служба аб стане надвор'я, якая праводзіцца метстанцыямі, прыцягнутымі да абслугоўвання чыгуначнага транспарта, па апавяшчэнню адпаведных агентаў чыгункі. Своечасовыя апавяшчэнні з метстанцый адказных агентаў чыгункі (служба пуці, руху, сувязі, цягі і г. д.) аб

стане надвор'я на лініі, і наступленні пагружаючых яго з,яў для чыгуначнага транспарта, дае магчымасць апошнім прыняць меры к забеспячэнню правідловасці, непрарыўнасці і безапаснасці руху цягнікоў, дзеяння сувязі, сігналізацыі, утрымання ў належным стане пуці, розных тэхнічных пабудоў, рэгуліраваць розныя штодзенныя, сувязанныя з надвор'ем транспортных апэрацый, што ў значнай ступені зменшае выдаткі па барацьбе з шкоднымі з'явамі надвор'я.

Высокаякасная інфармацыйная служба можа быць толькі тады, калі яна дакладна праводзіцца метстанцыямі па інструкцыях і схэмах выпрацаваных для гэтай мэты. У бягучым годзе яна праводзіцца згодна наступных інструкцый выпрацаваных ЦБН у 1933 годзе: Настаўленне ЦБН № 48 аб інфармацыі лінейных агентаў чыгункі, № 49 аб экстрэнных папярэджваннях, № 50 аб мецелевай службе і № 25 аб падачы групы „Мего".

Задача кожнага працаўніка метст. у першую чаргу заключаецца ў тым, каб дакладна прапрацаваць іх і добра засвоіць парадак абслугоўвання чыг. транспарта чаго яшчэ не бачна на некаторых метст.: Менск, Бычыха, і інш. Дасылаемыя ў дырэкцыю дарогі тэлеграмы з паказаных метст. маюць грубыя памылкі (паказваецца бачнасць да 6 км., не паказан час пачатка з'яўлення тумана, яго канец), — чаго не было-б калі работнікамі метст. былі-б добра засвоены інструкцыі.

Такая інфармацыя замест карысці прыносіць толькі шкоду, перагружая тэлеграф перадачай лішніх тэлеграм.

Акрамя абавязковай інфармацыі адпаведных агентаў чыгункі—вялікае папулярызацыйнае значэнне мае арганізацыя на чыгуначнай станцыі, ў дзяжурных комнатах для паездных брыгад, вітрыны надвор'я, з змяшчэннем у іх прагнозаў надвор'яў, звестак аб стане надвор'я па даным метстанцыі. На гэтае мерапрыемства метстанцыямі зварачваецца недастаткова ўвагі, як і на пастаноўку ўліку эфектыўнасці абслугоўвання чыгуначнага транспарта. Гэтыя недахопы павінны быць улічаны метстанцыямі ў бягучым годзе. Каб добра паставіць абслугоўванне чыг. транспарта неабходна ўпартая праца калектыва працаўнікоў метстанцый над павышэннем сваей кваліфікацыі. Можна добра ведаць інструкцыі, парадак абслугоўвання, але не аўладаўшы тэхнікай сваей справы нельга паставіць высокаякаснае абслугоўванне чыг. транспарта.

Дабіцца належнай пастаноўкі тэхвучобы і высокай якасці метабслугоўвання чыгуначнага транспарта магчыма толькі, шырока разгорнуўшы соцыялістычныя метады працы соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Неабходна памятаць, што „адказнасць за нашы прарывы і недахопы ў працы кладуцца отныне на дзевяць дзесятых не на „аб'ектыўныя" умовы, а на нас саміх, і толькі на нас" (СТАЛІН).

Кузьмін

Копия.

ПРИКАЗ № 86|274

по Единой Гидро-метеорологической Службе СССР.

г. Москва от 13 июля 1934 г.

В целях рационализации сроков производства метеорологических наблюдений, отменить с 1 января 1935 г. производство на метстанциях срочных наблюдений в 21 час, введя вместо указаного срока наблюдения в 22 часа. Данными наблюдений в 22 часа пользоваться при составлении месячных таблiц и выводах средних величин за сутки, дэкаду и месяц.—

НАЧ. ЦУЕГМС СССР (ФАЙНШТЕЙН)

Верно (подпись)

Адказны рэдактар П. Мамаеў.

Друк. БелАН. Зак. № 404. Гарлiт № 7300. Тыр. 600 экз. 9 стар.

Москва

Софийская Набережная № 8

Гидрометеорологическая станция Ц.Б.К.

БЕСПЛАТНО
Согласно пост. НКП
от 10-VII-30г.
„Известия“ ЦИК СС[С]Р
от 18-VII-30г. № 15[...]

Гідра[...]
служба
Б.С.С.Р.
Менск

МЕНСК БССР 10 1 35

МОСКВА 12 1 35

35 11 1 14 ч. 47 ОТД.

11 1 1935